## § 34. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення (у творным склоне адзіночнага ліку)

**208.** Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку.

### Белая Русь

Шчочку да вуснаў туліць,
Каб таямніцу спытаць:
— Белая Русь, матуля, —
Гэта дзяўчынка? Так?
Як называецца дзіўна...



Ты пра яе раскажы.
— Белая Русь — Радзіма
Перад табой ляжыць.
Крыкні — яна адгукнецца,
Звонам гарачых кос.
Кропля з ліста сарвецца,
Ускалыхнецца плёс*.
Даль захлынецца громам —
Белая Русь запяе.
І азарыцца Нёман —
Чыстае вока яе.

*Д. Бічэль.*

Выпішыце з верша назоўнікі, паставіўшы іх у пачатковую форму і згрупаваўшы ў тры слупкі ў адпаведнасці са скланеннем: 1, 2 і 3-е. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Праскланяйце назоўнік 3-га скланення. Праверце правапіс канчаткаў па схеме.

Родны, Давальны, Месны → ***-ы, -і***
Творны → ***-у, -ю***

**У залежнасці ад тыпу асновы назоўнікі 3-га скланення ў родным, давальным, месным склонах маюць канчаткі *-і, -ы*: *ноч***ы***, *рыс***і***, *радасц***і***.**

**У творным склоне адзіночнага ліку назоўнікі 3-га скланення ў залежнасці ад апошняга зычнага асновы маюць канчаткі *-у, -ю*: *ночч***у***, *рысс***ю***, *радасц***ю***.**


Правообладатель Национальный институт образования

**209.** Прачытайце верш. Падбярыце да яго загаловак.

Знаёмцеся: мы гараджане.
Наш горад расце ў добры час.
Завёмся мы проста — мінчане.
Мінск найдаражэйшы для нас.
Прыходзім у парк грамадою,
Стаім на прыгожым мастку.
Любуюцца вербы сабою —
Глядзяцца ў Свіслач-раку.
Спяшаем да плошчы славутай,
Дзе помнік адважным байцам.
Стаім у маўчанні мінуту,
І Вечны агонь свеціць нам.

*Н. Галіноўская.*

Якія славутыя мясціны Мінска згадваюцца ў вершы? Запішыце іх назвы. Знайдзіце сярод запісаных слоў назоўнік 3-га скланення. Перабудуйце сказ, у якім ужываецца гэты назоўнік, так, каб ён стаяў у форме творнага склону.

Запішыце першыя чатыры радкі верша. Падкрэсліце назоўнікі. Вусна ахарактарызуйце іх разрады паводле значэння.

**210.** Запішыце назоўнікі ў форме творнага склону. Праверце правапіс канчаткаў па схеме (с. 100).

1. Квецень, гладзь, шчодрасць, прыгажосць, радасць, намаразь, памяць. 2. Рэч, мыш, шчолач, ноч. 3. Глыб, верф, Свір, шыр.

З назоўнікамі першай групы складзіце сказы, у якіх апішыце: 1) прыроду вашага краю; 2) сады вясной у вашым горадзе (вёсцы); 3) рысы характару, уласцівыя вашым землякам.

Калі апошні зычны асновы назоўніка 3-га скланення стаіць пасля галоснага, то ён падаўжаецца: *бель — беллю, рунь — рунню*; калі пасля зычнага — не падаўжаецца: *вернасць — вернасцю, радасць — радасцю*.



Правообладатель Национальный институт образования

Не падаўжаюцца зычныя ***б, п, м, р, ф, ў***. Пасля іх (акрамя ***ў***) перад канчаткам ***-ю*** пішацца ***апостраф***: *Сібір — Сібір’ю; любоў — любоўю.*

**211.** Прачытайце тэкст, ставячы словы, што ў дужках, у правільную форму. Чаму тэкст мае такую назву? Падбярыце да тэксту свой загаловак. Спішыце, вызначце склон і скланенне назоўнікаў.

**Бацька гарадоў беларускіх**

Полацк... Услухайцеся: у самім *(гучанне)* гэтага слова — гісторыя. Яна адчуваецца і ў *(посвіст)* стралы, і ў лагодным *(перашэптванне)* хваляў Дзвіны, і ў лёгкім *(подых)* *(ветрык)*, і ў *(прыгажосць)* блізкіх азёраў.

Полацк — гэта і велічныя абрысы Сафіі, і старажытны вал, і Чырвоны мост, і маленькая царква над Палатой. Менавіта адсюль і пачынаўся Полацк.[сн]

Калі сёння падняцца па вузкай *(сцяжынка)* ўздоўж вала, можна ўбачыць, як высока пад неба ўздымае свае вежы храм Святой Сафіі. Гэта самае прыгожае месца ў *(горад)*, якое радуе вока, усяляе *(павага)* і гонар *(Паводле Н. Гальпяровіча)*.

Назавіце апорныя словы, з дапамогай якіх можна расказаць пра Полацк. Якое месца сярод іх займаюць назоўнікі?

Складзіце тэматычны слоўнік, уключыўшы ў яго назвы прыродных аб’ектаў, выдатных мясцін, славутасцей вашай малой радзімы (горада, раёна, мястэчка, вёскі). Выкарыстоўваючы словы ў якасці апорных, падрыхтуйце выказванне «Партрэт маёй малой радзімы».

**212.** Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

1. Чужая старонка без ветр.. сушыць. 2. Хто страціў Радзіму, той плача ўсё жы*(цц/ц)*ё. 3. Кожная птушка сваё гн..здо ведае. 4. Родная зямля мя..чэйшая за чужую пярыну. 5. У сваім кра*(і/ю)*, як у ра*(і/ю)*.

Падкрэсліце назоўнікі, у якіх пры змене граматычнай формы адбываецца чаргаванне зычных перад канчаткам. У якіх склонах назіраецца такая з’ява?



Правообладатель Национальный институт образования